






Свята ў прыпяцкіх палешукоў — «Кліч Палесся» зноў сабрала прыхільнікаў і захавальнікаў этнакультурных традыцый. У мінулую суботу ў вёску Ляскавічы Петрыкаўскага раёна (цэнтр Нацыянальнага парку «Прыпяцкі») прыехалі прафесіянальныя работнікі культуры і аматарскія народныя калектывы, рэпертуар якіх складаюць мясцовыя абрадавыя і бытавыя песні розных мясцовасцяў і вёсак. Фестываль стаў сапраўдным брэндам: ён праводзіўся шосты раз. Было што і паглядзець, і паслухаць, і пасмакаваць, як і нагод далучыцца да рамесніцкай справы. Ці трэба казаць, што прыўзняты настрой быў ва ўсіх — ад самых маленькіх удзельнікаў свята і да яго ганаровых гасцей, намесніка прэм'ер-міністра Аляксандра Субоціна і старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя Салаўя.

А для мяне як фотакарэспандэнта падзей было аж занадта — здымай не хачу... Новым афармленнем прыемна здзівіла само месца свята — на канцэртна-кірмашовай прасторы з'явіліся цікавыя будынкі — высокая вежа з аглядальнай пляцоўкай, карчма з чаротавай страхой, вятрак. Гасцявыя падворкі раёнаў Гомельскай і Брэсцкай абласцей утульна размясціліся ў цэнтры святочнай пляцоўкі, з усіх напрамкаў да іх вялі своеасаблівыя бальшакі, гасцінцы, прасёлкі і сцежачкі.

«Кліч Палесся» — назва вельмі актуальная ў нашым урбанізаваным і мітуслівым жыцці. Яна як малітва, як просьба, як напамін. А можа, і як рэквіем... Мы часта адрываемся ад родных каранёў, забываем Бацькаўшчыну, не ведаем пра свой радавод, звычаі і традыцыі, купляемся на чужое і таннае. А этнакультура Беларускага Палесся — залаты духоўны скарб, які неабходна захоўваць і якім, вядома, варта ганарыцца.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

# КУДЫ КЛІЧА ПАЛЕССЕ?







